УДК 947.6 «1917»

М. Я. Сяменчык, дацэнт

# АБ СТАНЕ ЗАКОННАСЦІ І ПРАВАПАРАДКУ НА БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА АБНАЎЛЕННЯ РАСІЙСКАГА ГРАМАДСТВА Ў САКАВІКУ – КАСТРЫЧНІКУ 1917 ГОДА

The article dwells upon low and order situation in Belarus in the context of the Revolutionary renewal of Russian society in the period of March – October 1917. General estimation is given to the treatment of this question in scientific and training historical works. The author pays attention to constructive interactions between the Provisional Government, Petrograd Soviets and local Soviets during the establishing of new power bodies. Law and order state is characterized; main reasons for its deterioration are explained; the absence of anti-governmental activity before the October revolution in Belarus is concluded by the author as well.

**Уводзіны.** Партыйныя гісторыкі Беларусі абыходзілі пытанні аб станоўчых зменах, якія адбываліся ў краіне пасля краху самаўладдзя. Куды большая ўвага надавалася імі стыхійным выступленням народных мас як паказчыку наспявання чарговай рэвалюцыі. У 1997 г. вядомы расійскі навуковец У. П. Булдакоў у манаграфіі «Красная смута. Природа и последствия революционного насилия» (М., 1997) паказаў прычыны, змест і разбуральныя наступствы такіх «выступленняў». Але, як вынікае з «Гісторыі Беларусі» пад рэдакцыяй прафесараў Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля (Мінск, 2007), трактоўка гэтага пытання застаецца нязменнай. У той самы час ў азначаным творы не прыгадваецца канструктыўная дзейнасць Чарговага ўрада і яго мясцовых органаў, стан законнасці і правапарадку, што, акрамя іншага, перашкаджае асэнсаванню прычын наспявання палітычнага крызісу ў краіне, у тым ліку на Беларусі восенню 1917 г.

**Асноўная частка.** Як вядома, выступленні петраградскіх рабочых 25–27 лютага 1917 г., падтрыманыя салдатамі, прычыніліся да звяржэння і арышту царскага ўрада. Каб прадухіліць эскалацыю палітычнай напружанасці, перасекчы гвалт у дачыненні да афіцэраў і іншых службовых асоб, падпалы паліцэйскіх і судовых устаноў, Часовы камітэт Дзяржаўнай думы і Петраградскі Савет звярнуліся да насельніцтва і ўзброеных сіл краіны з заклікам да яднання, захавання парадку і спакою. Генералітэт усведамляў сваю адказнасць за баяздольнасць ўзброеных сіл і надаваў першаступенную ўвагу не лёсу манархіі, а абароне краіны. У выніку 2 сакавіка Мікалай II пасля перамоў з думскай дэлегацыяй і вышэйшым камандаваннем падпісаў два Маніфесты: аб сваім адрачэнні ад трона на карысць брата і аб зацвярджэнні новага кабінета міністраў на чале з Г. Я. Львовым. Варта адзначыць, што гэты апошні царскі дакумент адыграў сваю станоўчую ролю ў легітымацыі Часовага ўрада.

Дэкларацыя кабінета міністраў, абнародаваная 3 сакавіка 1917 г., успрынялася грамадствам не толькі як праграмны дакумент, але і як прававы акт. Абвешчаныя ў ёй правы і свабоды, палітычная амністыя, скасаванне корпусу жандараў, паліцыі і арганізацыя міліцыі сталі неадкладна, яшчэ да з'яўлення адмысловых цыркуляраў укараняцца ў жыццё. Усе кардынальныя палітычныя і эканамічныя пераўтварэнні ўскладаліся на Устаноўчы сход, а да часу яго склікання ўся вышэйшая выканаўчая і заканадаўчая ўлада канцэнтравалася ў асобе ўрада, названага Часовым. Такім чынам, грамадства набывала рэальныя шанцы рэфармавання палітычнай сістэмы, вырашэння ўсіх злабадзённых праблем, пабудовы прававой дзяржавы мірным шляхам.

Фарміраваннем новых органаў аховы правапарадку заняліся адмысловыя грамадскія камітэты з апорай на гарнізонных вайскоўцаў і служачых арганізацый па абслугоўванні фронту. Пасля распараджэння губернскіх камісараў, прызначаных урадам замест губернатараў, былыя паліцэйскія і жандары мусілі перадаць міліцыянерам службовыя памяшканні, архівы і зброю. Здаралася, што па ініцыятыве грамадскіх камітэтаў (Бабруйск, Віцебск, Орша) жандары і гарадавыя падвяргаліся арышту, але ў далейшым усе яны (прыдатныя да службы ў арміі) перадаваліся ў распараджэнне вайсковых начальнікаў [1, с. 26]. Да таго ж часу па загадзе ваеннага міністра А. Гучкова былі адпраўлены ў адстаўку «нядобранадзейныя» генералы. Пазбавіліся пасад і асобныя судовыя работнікі вышэйшага звяна [1, с. 30]. Начальнікі віцебскага [2] і мінскага [3] губернскіх жандарскіх упраўленняў былі прыцягнуты да

следства па справах аб сваёй ранейшай дзейнасці, а начальнік аршанскай жандармерыі – за чарнасоценную агітацыю [4].

Варта заўважыць, што на Беларусі пагроза новаму ладу выявілася не з боку міфічных «ворагаў рэвалюцыі», а ў асобе анархічна настроеных груп вайскоўцаў. Так, 3 сакавіка на станцыі «Корсаўка» Рыга-Арлоўскай чыгункі салдаты «з чырвонымі на грудзях стужкамі» абстралялі афіцэраў [5, л. 4]. У той жа дзень у Рэжыцы група салдат, назваўшыся дэлегатамі з Петраграда, разграміла паліцэйскае ўпраўленне і вызваліла з турмы зняволеных [6, л. 19.] У Рагачоўскім павеце салдатамі было разрабавана шмат памешчыцкіх маёнткаў і яўрэйскіх лавак. Каб прыпыніць пагромшчыкаў, камандаванне накіравала супраць іх вайсковыя часці [7]. У сакавіку сялянскія правапарушэнні не былі характэрнымі для беларускай вёскі [8, с. 10].

Часовы ўрад і камандаванне ўсведамлялі небяспеку аслаблення ўлады. Невыпадкова адразу ж пасля таго, як у гарадах сфарміраваліся грамадскія камітэты, а ў губернскіх і павятовых цэнтрах пачалі дзейнічаць камісары, важнейшым напрамкам іх працы стала стварэнне атрадаў міліцыі і барацьба за строгае выкананне зноў прынятых законаў. З моманту свайго ўтварэння значную ролю ў падтрымцы правапарадку ў гарадах і мястэчках адыгрывалі Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Высокая ступень арганізаванасці і палітычнай свядомасці жыхарства спрыяла захаванню законнасці. Менавіта гэтыя якасці дазволілі падаўляючай большасці рабочых яшчэ да склікання Устаноўчага схода ў межах існаваўшага заканадаўства дамагчыся 8-гадзіннага працоўнага дня, рэалізацыі дэмакратычных правоў і свабод.

У ліку першых крокаў Часовага ўрада па вырашэнні жыццёвых праблем грамадзян было абвяшчэнне 25 сакавіка «хлебнай манаполіі», у адпаведнасці з якой харчовыя прадукты з сялянскіх і памешчыцкіх гаспадарак мусілі прадавацца толькі дзяржаўным нарыхтоўчым службам. З той жа мэтай была выдадзена ўрадавая пастанова ад 11 красавіка «Аб ахове пасеваў». Звязаныя з ёй праблемы, у тым ліку рэгламентацыя ўзаемаадносін сялян з памешчыкамі адносна пуставаўшых участкаў, ускладаліся на рэарганізаваныя харчовыя камітэты. Перспектыва вырашэння аграрнага пытання Устаноўчым сходам ставіла ў парадак дня неабходнасць уліку ўсіх зямель і актуалізавала фарміраванне адмысловых зямельных камітэтаў [8, с. 13]. Гэтыя мерапрыемствы патрабавалі велізарнай колькасці работнікаў, з'арыентаваных на рэалізацыю не класава-партыйных, а дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў. У ліку тых, хто першымі адгукнуўся на ўрадавыя захады, былі менавіта партыйныя дзеячы, найперш эсэры.

Пастановы ўрада аб выбарах усесаслоўных валасных выканаўчых камітэтаў, рэарганізацыі земскіх і гарадскіх самакіраванняў, нізавых харчовых і зямельных камітэтаў ва ўмовах надання ўсім грамадзянам роўных выбарчых правоў абумовіла вызначальную перавагу ў азначаных структурах прадстаўнікоў тых пластоў насельніцтва, якія традыцыйна займалі ніжэйшую прыступку ў сацыяльнай лесвіцы. З улікам салдацкай масы роля так званай «рэвалюцыйнай дэмакратыі» ў фарміраванні органаў дзяржаўнай улады рабілася вызначальнай. Парадак, заснаваны на прынцыпе абрання (а не прызначэння) работнікаў на кіруючыя пасады, стаў звычайнай з'явай. Да лета амаль усе камісары, хто заняў сваю пасаду, «перасеўшы» з крэсла старшыні земскай управы, былі пераабраны [1, с. 118–119]. Але калі крытэрыем вартасці кандыдата на губернскую або павятовую пасаду была яго кампетэнтнасць і адукацыя, то на ўзроўні валасці сімпатыі выбаршчыкаў выклікалі наяўнасць у абранніка домаўладання, добрай гаспадаркі, даверу грамады і г. д. Невыпадкова, што з выхадам пастаноў аб хлебнай манаполіі, рацыянальным выкарыстанні пуставаўшых глебы і пашы, у іх ажыццяўленні па прычыне адвольнага тлумачэння мясцовымі работнікамі сталі назірацца маёмасныя правапарушэнні. Так, у маі сяляне Мінскай і Віленскай губерняў, успрыняўшы рэзалюцыю свайго з'езда па зямельным пытанні як законны акт, пачалі секчы лес памешчыкаў, пасвіць жывёлу на іх пашы і г. д. Такія ж з'явы сталі назірацца і на Магілёўшчыне пасля вяртання сялянскіх дэпутатаў з Усерасійскага з'езда Саветаў [9].

Асабліва актыўную ролю ў аграрнай сферы адыгрывалі эсэры, якія пераважалі ў адпаведных урадавых структурах – ад Міністэрства земляробства да валасных зямельных камітэтаў. Менавіта іх намаганнямі яшчэ да аб'явы даты склікання Устаноўчага схода азначаныя камітэты пачалі «браць на ўлік» памешчыцкую маёмасць, а фактычна карыстацца ёю, што выклікала негатыўную рэакцыю кадэцкіх міністраў. Гэтую пазіцыю па няўхільным захаванні існуючага заканадаўства да склікання Устаноўчага сходу ў пэўнай ступені падтрымлівалі правыя меншавікі і эсэры, а таксама народныя сацыялісты. У той самы час бальшавікі заклікалі да неадкладнай канфіскацыі памешчыцкай маёмасці і перадачы яе сялянам. А восенню заклікі сталі пераходзіць у практычную плоскасць, калі ў Барысаўскім павеце група салдат на чале з П. Голубам ажыццявіла каля 20 такіх канфіскацый [10, с. 344].

Парушэнні законнасці адбываліся і з боку непадкантрольных зямельным камітэтам асобных сялянскіх грамад, якія па ўласнай ініцыятыве імкнуліся палепшыць свой дабрабыт за кошт чужой маёмасці. Менавіта гэтая катэго-

рыя сялянства лёгка ішла на кантакт з салдатамі і сумесна з імі дамагалася свайго [11, с. 122]. Як правіла, валасная і павятовая міліцыя была не ў стане прадухіліць такія правапарушэнні і не знаходзіла вінаватых. Адпаведна на вёсцы сталі ўзрастаць настроі беспакаранасці. Так, законы ваеннага часу, уведзеныя ў краіне на пачатку сусветнай вайны, пасля рэвалюцыі практычна не дзейнічалі. З заканадаўства былі выдалены артыкулы аб смяротнай кары і катарзе. Але нягледзячы на тое, што большасць законаў заставаліся нязменнымі, на практыцы іх выкарыстанне, да прыкладу, супраць парубшчыкаў лесу, было вельмі рэдкім.

Варта адзначыць, што асноўная маса сялянства, згуртаваная традыцыямі абшчыны, у дасягненні сваіх інтарэсаў абапіралася, як правіла, на пастановы «сваёй» мясцовай улады, якія нярэдка разыходзіліся з урадавымі законамі. У выніку санкцыянаваную валаснымі выканаўчымі, харчовымі ці зямельнымі камітэтамі перадачу сялянам тых ці іншых угоддзяў памешчыкі ўспрымалі як захоп, анархію і г. д. і апелявалі да вышэйшых інстанцый або ваеннага камандавання [1, с. 121]. На думку начальніка мінскай міліцыі М. Фрунзе, у маі – чэрвені прычынай непарадкаў у вёсцы з'яўлялася «адсутнасць у многіх месцах зямельных камітэтаў і якіх бы то ні было судоў...» [12]. Зусім невыпадкова таму бытавалі самасуды, пры якіх рабаўнікі збіваліся «да страты прытомнасці» [13].

Нізкая прававая культура вяскоўцаў асабліва выразна выявілася падчас земскіх выбараў, калі сяляне, абураныя незразумелай ім працэдурай тайнага галасавання, успрынятай ім як спроба абману, чынілі гвалт у адносінах членаў выбарчых камісій [1, с. 130].

Аб'ектыўна на проціпраўныя дзеянні сялян уплывала і непаслядоўная ўрадавая палітыка ў ажыццяўленні хлебнай манаполіі, зусім нявыгаднай ім ва ўмовах няўстойлівых закупачных цэн і перабояў цэнтралізаваных паставак тавараў першай неабходнасці. У выніку восенню нават ва ўмовах цяжкага харчовага становішча сялянства зрабілася асноўным пастаўшчыком самагону вайскоўцам [1, с. 172] а яго абяцанні аб падтрымцы новага ладу і выкананні законаў выконваліся роўна ў той ступені, наколькі гэта спрыяла абшчыннаму і асабістаму дабрабыту.

Даволі супярэчлівае стаўленне да законнасці і правапарадку назіраліся і ва ўзброеных сілах. Са звяржэннем самаўладдзя і прыняццем прысягі Часоваму ўраду камандаванне адчувала патрэбу вайскоўцаў у абнаўленні армейскіх парадкаў, але яўна недаацаніла небяспеку зніжэння дысцыпліны. Так, у пачатку сакавіка ваенны міністр А. Гучкоў паспрабаваў ўсталяваць у арміі «таварыскія» адносіны праз скасаванне катэгорыі «ніжніх чыноў», а яго пераемнік А. Керанскі сваёй майскай «Дэкларацыяй правоў салдата і грамадзяніна» [4, с. 79] фактычна падарваў існаваўшую службовую субардынацыю. У выніку разлік урада на ўмацаванне дысцыпліны, адзінства салдат і афіцэраў і як асноўнай мэты – баяздольнасці «рэвалюцыйнай арміі» для працягу «абарончай» вайны, не спраўдзіўся. Дэмакратызацыя армейскага жыцця вылілася ў ліквідацыю поўнаўладдзя камандзіраў, у партыйнае (і міжпартыйнае) і службовае (паміж салдатамі і афіцэрамі) процістаянне, ахапіла фронт і тыл, ўзмацніла антыўрадавыя і антываенныя настроі.

Апошняя акалічнасць выразна адбілася на ўзрастанні колькасці дэзерціраў, барацьба з якімі зрабілася адной з буйнейшых праблем расійскага грамадства. Яе вырашэнне сіламі адных міліцыянераў было немагчымым, у тым ліку па прычыне іх малалікасці, распыленасці і слабай прафесійнай падрыхтоўкі. Невыпадкова таму да барацьбы з дэзерцірствам прыцягваліся цывільныя і вайсковыя ўлады, грамадскія арганізацыі, жыхары гарадоў і вёсак [14].

Узрастанне анархічных працэсаў у арміі і тыле, асабліва пасля правалу летняга наступлення і падзей у сталіцы 3–5 ліпеня, выклікалі прыняцце міністрам-старшынёй А. Керанскім пастаноў аб увядзенні ваенна-рэвалюцыйных судоў і смяротнай кары за пэўныя віды вайсковых злачынстваў [1, с. 148]. Але гэтыя захады плёну не прынеслі, наадварот, далі падставу да абвінавачванняў урада ў контррэвалюцыйнасці. Карнілаўскі мяцеж канчаткова падарваў давер вайскоўцаў да ўрада і камандавання. Усе далейшыя звароты міністраў, савецкіх і партыйных (акрамя бальшавікоў) лідэраў да салдат з заклікамі да выканання «рэвалюцыйнага абавязку» станоўчага плёну не далі. Лозунг абарончай вайны канчаткова сябе дыскрэдытаваў і быў адкінуты. Вядома, што тая салдацкая маса, якая не падпарадкавалася камандзірам і не выконвала сваіх прамых функцый, ужо не магла быць гарантам дэмакратычных пераўтварэнняў. Яшчэ ў большай, чым у акопнікаў, ступень раскладання назіралася ў тылавых часцях.

Варта падкрэсліць, што на Беларусі прысутнасць салдат у гарадах і мястэчках, населеных большай часткай яўрэямі, не гарантавала апошнім поўнага спакою. Так, у сярэдзіне мая «падвыпіўшыя салдаты прыняліся граміць палац» Святаполк-Мірскага, а затым накіраваліся ў Мір з мэтай учынення яўрэйскага пагрому. Становішча выправіў салдацкі камітэт, які выклікаў у мястэчка ўвесь полк і тым уратаваў яго жыхароў [15]. У канцы ліпеня ў Калінкавічах салдаты ўчынілі пагром прывакзальных лавак, а «жыхары ў паніцы сталі ўцякаць у навакольныя вёскі» [16]. Пагроза пагромаў пастаянна прысутнічала ў Бабруйску, Віцебску, Гомелі. Восенню тутэйшыя жыхары з апорай на Саветы

стваралі атрады самаахo

вы. Тым не менш 24–25 кастрычніка пагромы ўсё ж адбыліся ў Глыбокім, Рэчыцы, Ярэмічах (Навагрудскі пав.) [17].

Відавочна, што для ўзброеных людзей законаў ужо не існавала. У кастрычніку – лістападзе з прычыны нездавальняючага забеспячэння арміі харчовымі прадуктамі, а таксама пад уздзеяннем рэвалюцыйных падзей у Петраградзе на Беларусі парушэнне правапарадку ў выглядзе захопаў панскай маёмасці, рабаўніцтва, гвалтаў набыло масавы характар. Як паведамляў начальнік штаба Заходняга фронту на адрас мінскага губернскага камісара, «...пераважна ў большасці гэтыя злачынствы творацца салдатамі ў раёнах размяшчэння войскаў» [18]. Такія ж прыкладна падзеі адбываліся на Віцебшчыне, з удзелам часцей Паўночнага фронту, а таксама ў «тылавой» Магілёўскай губерні.

**Заключэнне.** Такім чынам, па меры палітызацыі грамадскага жыцця, пагаршэння эканамічнага становішча, зніжэння аўтарытэту Часовага ўрада і інш. законы гублялі сілу нават у сялянскім асяроддзі, якое традыцыйна вызначаліся сваёй законапаслухмянасцю. З лета – восені асноўная маса салдат ужо мала адпавядалі статусу абаронцы рэвалюцыі і кіравалася ўласнымі інтарэсамі. Тым не менш у азначаны перыяд на Беларусі не назіралася праяў «рэвалюцыйнага гвалту» або антыўрадавых акцый. Са свайго боку ўрадавыя органы таксама не мелі патрэбы ў карніцкіх акцыях, уласцівых першай рускай рэвалюцыі. Нават ліквідацыя карнілаўскай Стаўкі скончылася без адзінай ахвяры. Відавочна, што восенню на Беларусі прыкметы наспяваючага крызісу не закраналі палітычнай сферы, а адбіліся ў сялянскіх захопах панскай маёмасці, заняпадзе дысцыпліны вайскоўцаў і дэзерцірстве, яўрэйскіх пагромах. Характэрна, што асноўная маса жыхарства працягвала звязваць надзеі на лепшае выключна са скліканнем Устаноўчага схода.

### Літаратура


1. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.): у 2 ч. / М. Я. Сяменчык. – Мінск: БДПУ, 2001. – Ч. I: Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах дэмакратычнага рэжыму. – 200 с.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 2533. Воп. 1. Спр. 69. Л. 112. Справы Віцебскага каменданцкага упраўлення (1915–1917).
3. К делу минской охранки // Новое варшавское утро. – 1917. – 2 мая. – С. 4.
4. Задержания // Оршанский вестник. – 1917. – 7 мар. – С. 2.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 622. Воп. 1. Справы канцылярыі Віцебскага губернскага камісара.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 60. Воп. 3. Спр. 242. Л. 19. Справы Інстытута гісторыі партыі і сацыялістычнай рэвалюцыі пры ЦК КПБ.
7. Погромы // Известия Петроградского Совета. – 1917. – 7 апр. – С. 2.
8. Рыжанкоў, І. М. Сялянства Беларусі ў вырашэнні грамадска-палітычных і эканамічных праблем (сакавік – кастрычнік 1917 г.): аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02. / І. М. Рыжанкоў ; Бел. дзярж. тэхнал. ун-т. – Мінск, 2006. – 24 с.
9. Аграрное движение // Народное слово. – 1917. – 20 июня. – С. 4.
10. В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте / Под ред. Н. А. Халипова, Н. М. Мешкова. – Минск: Гос. изд-во БССР, 1957. – 372 с.
11. Смольянинов, М. М. Революционное сознание солдат Западного фронта в 1917 г. / М. М. Смольянинов. – Минск: «Навука і тэхніка», 1991. – 264 с.
12. Аграрное движение // Вестник минского губернского комиссариата. – 1917. – 17 июня. – С. 4.
13. Самосуды // Народное слово. – 1917. – 23 июня. – С. 3.
14. Аресты дезертиров // Вестник минского губернского комиссариата. – 1917. – 1 авг. – С. 4.
15. Разгром дворца Святополк-Мирского // Русское слово. – 1917. – 25 мая. – С. 4.
16. Убийство трех офицеров // Рабочая мысль. – 1917. – 28 июля. – С. 2.
17. Сяменчык, М. Я. Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця і рэцыдывы антысемітызму на Беларусі (вясна – восень 1917 г.) / М. Я. Сяменчык // Труды БГТУ. Сер. V, Политология, философия, история, филология. – 2004. – Вып. XII. – С. 14; Разгром магазинов // Народное слово. – 1917. – 21 окт. – С. 4.
18. Телеграмма // Вестник минского губернского комиссариата. – 1917. – 15 нояб. – С. 4.